# Міхась Лявонавіч Стральцоў

14 лютага 1937 - 23 жніўня 1987



# Дзяцінства Міхася Стральцова

Міхась Лявонавіч Стральцоў нарадзіўся 14 лютага 1937 г. у вёсцы Сычын Слаўгарадскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і сельскага настаўніка. Бацька – Лявон Клімавіч – быў дырэктарам школы, а маці – Марына Міхайлаўна – займалася хатняй гаспадаркай.

Пра дзяцінства ён пазней раскажа ў сваіх творах, адзін з якіх так і будзе называцца «Дзяцінства, якое мы помнім».Гэта аповед пра пакаленне, на долю якога выпала вайна.

# Пачатак творчасці

У 1954 г. будучы пісьменнік скончыў Нова-Ельненскую сярэднюю школу, а праз пяць гадоў (у 1959 г.) – і аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сваё далейшае жыццё Міхась Стральцоў звязаў з журналістыкай: ён працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» (1959-1961) і часопісах «Полымя» (1961-1962), «Маладосць» (1962-1968). У 1983г. незадоўга да заўчаснай смерці, стаў загадчыкам аддзела крытыкі часопіса «Нёман».

# Творы аўтара

Першае апавяданне «Дома» надрукаваў у 1957г. у часопісе «Маладосць». Міхась Стральцоў аўтар зборнікаў апавяданняў «Блакітны вецер» (1962), «Сена на асфальце» (1966); аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970); кнігі прозы «Падарожжа за горад» (апавяданні, аповесць, 1986); кніг выбраных твораў «На ўспамін аб радасці» (1974), «Выбранае» (проза, паэзія, эсэ, 1987). Выйшлі зборнікі вершаў «Ядлоўцавы куст» (1973), «Цень ад вясла» (1979), «Яшчэ і заўтра» (1983), «Мой свеце ясны» (1986).

# Нечаканыя факты

- Па ўспамінах Леаніда Дранько-Майсюка: «Стральцоў заўсёды сьмяяўся з тых паэтаў, якія пісалі вершы для эстрады. Лічыў, што гэта занятак ня варты сапраўднага творцы».
- Яго раздражнялі Ала Пугачова, Сафія Ратару, ня быў прыхільнікам «Песьняроў»; адзіны, каго любіў — Вахтанг Кікабідзэ. «У-у-у! Жулік!» —прыгаворваў задаволена Стральцоў падчас ягонага выступу.
- Дранько-Майсюк у эсэ «Адзіноцтва зоркі» піша: «раптам загаварыў пра Сальеры: ён не злачынец; легенда аб тым, што ён атруціў Моцарта — проста выдумка ворагаў знакамітага італьянца...»

# Нечаканыя факты

- Іранічна ставіўся да беларускага тэатра.
- Выдатна разьбіраўся ў расьлінах.
- Лічыў, што наша літаратура па сваім «спосабе мысьленьня» паганская, У лісьце да Л. Дранько-Майсюка пісаў: «Мы, беларусы, наогул павінны блізка стаяць, паводле многіх прычын, да такога сьветаадчуваньня».

# Памёр Міхась Лявонавіч Стральцоў
# 23 жніўня 1987



*Я думаў, што кожны чалавек павінен добра ведаць сваё месца на зямлі, што кожны, урэшце, мае права любіць нешта асабліва моцна, - няхай так: гэта ўсё ж лепш, чым не любіць нічога.*

**Міхась Стральцоў**
*Сена на асфальце*